Источник: “Наша слова” – 2014-06-04

# 80 гадоў таму назад адбыўся I з’езд Саюза беларускіх пісьменнікаў

Саюз беларускіх пісьменнікаў (на момант заснавання Саюз пісьменнікаў БССР, СП БССР), добраахвотная грамадская творчая арганізацыя прафесійных літаратараў Беларусі, створаны паводле пастановы ЦК ВКП(б) ад 23.4.1932 “Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый” і пастановы ЦК КП(б)Б ад 27.5.1932 "Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый БССР". Арганізацыйна ўтварэнне СП БССР аформіў 1-ы Усебеларускі з’езд пісьменнікаў (Менск, 8-14.6.1934). Кіраўнічы орган - з'езд пісьменікаў БССР, паміж з'ездамі - праўленне. Старшыні праўлення: М.М. Клімковіч (1934-38), М.Ц. Лынькоў (1938 - 48), П.У. Броўка (1948-66), М.Танк (1966-1980), Н.С. Гілевіч (1980-89), В.В. Зуёнак (1989-98), У.П. Някляеў (1998-99), В. Іпатава (1999-2002), А. Пашкевіч (2002-11), Б. Пятровіч (з 2011).

У 1945 у СП БССР было 47 членаў, да 2-га з'езду пісьменнікаў (чэрв. 1949) -91, да 3-га (вер. 1954) - 114, да 4-га (люты 1959) -173, да 5-га (травень 1966) - 242. да 6-га (крас. 1971)-277, да 7-га (травень 1976) -304, да 8-га (крас. 1981) -319, да 9-га (крас. 1986) - 364 члены. На 1.1.1987 у СП БССР 371 член. На сёння ў СБП звыш 500 сяброў.

У 2005 ад Саюза аддзялілася група, якая стварыла альтэрнатыўны лаяльны да ўлады Саюз пісьменнікаў Беларусі.

Ад часу стварэння Саюз пісьменнікаў працаваў, дбаючы ў першую чаргу пра культуру краіны. За развіццё нацыянальнай культуры і папулярызацыю беларускай літаратуры сябры Саюза пісьменнікаў ушаноўваліся дзяржавай: 19 сябрам СП было прысвоена званне Народных пісьменнікаў і паэтаў; 3-ом - Народных артыстаў; 41-му - заслужаных дзеячоў культуры Беларусі; 10-ці - заслужаных дзеячоў навукі. Лаўрэатамі Дзяржаўнай прэміі Беларусі сталі 101 сябар арганізацыі; 4-ры літаратары мелі пажыццёвы статус Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь. Дзесяткі сяброў Саюза абіраліся народнымі дэпутатамі Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Саюз пісьменнікаў аб'ядноўваў і аб'ядноўвае акадэмікаў, членаў-карэспандэнтаў Нацыянальнай Акадэміі навук, дактароў і кандыдатаў навук.

Грамадскае аб'яднанне "Саюз беларускіх пісьменнікаў" (СБП) дзесяцігоддзі з'яўляецца фарпостам змагання за нацыянальную самабытнасць краіны, яе дэмакратызацыю, нястомна адстойвае правы аўтараў на свабоду выказванняў і думання.

Магутны інтэлектуальны патэнцыял арганізацыі паспрыяў усталяванню ў краіне шматлікім грамадскім аб'яднанням і рухам: "Мартыралог Беларусі", Беларускі Народны Фронт; Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада; Таварыства беларускай мовы; Рада беларускай інтэлігенцыі і інш.

Саюз беларускіх пісьменнікаў з'яўляецца ядром нацыянальнай інтэлігенцыі, паколькі ён аб'ядноўваў і аб'ядноўвае самых вядомых грамадзян Рэспублікі Беларусь. Да дзейнасці Саюза пісьменнікаў сваім жыццём і творчасцю спрычыніліся такія яго сябры, як Купала і Колас, Чорны і Крапіва, Лынькоў і Броўка, Танк і Куляшоў, Панчанка і Макаёнак, Скрыган і Мележ, Караткевіч і Адамовіч, Быкаў і Шамякін, Брыль і Навуменка, Барадулін і Гілевіч, дзесяткі іншых па-сусветнаму значных творцаў.

Пісьменніцкія з'езды, пасяджэнні Рады СБП маюць шырокі розгалас, прынятыя рашэнні і рэзалюцыі скіраваны на адстойванне свабоды слова, падтрымку дэмакратычных пераўтварэнняў у Беларусі.

Выданні:

“Літаратурная Беларусь” - культурна-асветніцкі праект ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу».

“Дзеяслоў” - літаратурна-мастацкі часопіс.

“Кніганоша” - сумесны праект Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» і Саюза беларускіх пісьменнікаў.

“Верасень” - літаратурна-мастацкае выданне для моладзі. Заснавана па ініцыятыве Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны, каб падтрымаць маладых літаратараў. Перыядычнасць выхаду - два разы на год.